ДАВЕДКА
да заданняў гарадскіх, раённых алімпіяд
па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

Заданні	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	Усяго
Балы	5	5	5	5	6	4	5	5	5	5	50

VI клас

Заданне 1. Адкажыце на пытанні.

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).

1. Традыцыйная беларуская страва, назва якой паходзіць ад слова "халодны", складаецца з цыбулі, кропу, шчаўя, агуркоў, буракоў або бацвіння. (*Халаднік.*)
2. Які беларускі горад называюць перыфразай: "Горад асілка Машэкі"? (*Магілёў.*)
3. У сюжэце мастацкага твора выдзяляюць некалькі ключавых момантаў – этапаў: экспазіцыя, завязка, … , развязка. Дапішыце ключавы момант, якога не хапае ў пераліку: (*кульмінацыя*).
4. Падбярыце прыказку, у якой выражана асноўная думка народнай легенды "Дамавікова ўдзячнасць" (*Нават самы люты звер за дабро дабром плоціць або іншыя прыказкі аб справядлівасці і дабрыні.*)
5. Прыгадайце назву аднаго з восеньскіх свят. Паводле народнага павер'я, у гэты дзень усе змеі хаваліся па норах, папярэдне збіраючыся ў адно месца, а наперадзе іх рухаўся змяіны цар. Змяіны яд у такую пару лічыўся смертаносным, таму ў гэты дзень сяляне пазбягалі наведваць лес. (*Узвіжанне або Звіжанне.*)

Заданне 2. Перакладзіце прапанаваныя назоўнікі на беларускую мову. Укажыце, якімі гукамі адрозніваюцца беларускія словы і іх рускамоўныя адпаведнікі.

Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).

Слова па-руску	Слова па-беларуску	Якімі гукамі адрозніваюцца
Узор: жёлудь	*жолуд*	*[д']–[д]*
пиджак	*пінжак*	*[т']–[т]*
подпись	*подпіс*	*[д]–[н]*
шёлк	*шоўк*	*[с']–[с]*
юмор	*гумар*	*[л]–[ў]*
орех	*арэх*	*[й']–[г]*
		[р']–[р]

Заданне 3. Аднавіце ўстойлівыя спалучэнні па іх агульным значэнні, пачынаючы са слова *глядзець*.

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).

"унікаць у сутнасць чаго-небудзь, звяртаць увагу на самае важнае"	глядзець	*глядзець у корань*
"думаць аб кім-небудзь, чым-небудзь аднабакова, са сваёй пазіцыі"		*глядзець са сваёй званіцы*
"адносіцца да кагосьці пагардліва"		*глядзець зверху ўніз*
"ідэалізаваць каго-небудзь, не заўважаць недахопаў"		*глядзець праз ружовыя акуляры*
"свядома або знарок не звяртаць увагу на што-небудзь (часцей адмоўнае)"		*глядзець скрозь (праз) пальцы*

Заданне 4. Уявіце сябе перакладчыкамі. Перакладзіце ўрывак з тэксту на беларускую мову.

Максімальная колькасць балаў – 5.

За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ

Тысячы сонечных зайчыкаў скакалі на агурочных лістах, асвятлялі іх нейкім таямнічым (таемным) святлом. Ад гэтага здавалася, што паветра пад лістамі, дзе сядзелі Нязнайка і Кнопачка, таксама хваліоецца, нібы махае незлічонымі крылцамі (крыльцамі), і ўсё гэта выглядала нейкім незвычайным і чароўным (Паводле М.М. Носава).

Заданне 5. Сярод прапанаваных загадак адзначце нумары тых, у якіх ужываюцца прыметнікі, што адпавядаюць адзначаным у табліцы характарыстыкам (правільных адказаў можа быць больш за адзін):

Максімальная колькасць балаў – 6 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

1. Глянеш – заплачаш, а ўсе яму рады.
2. Не звер, а махнаты, не конь, а з вушамі.
3. У каго вусы даўжэйшыя за панскія?
4. Без чаго найбяднейшы чалавек абедаць не сядзе?
5. У ліповым карытцы жывое варушыцца.
6. Повен падпечак белых авечак.
7. Як ляжыць, то меншая за ката, а як устане, то большая за каня.

Характарыстыка	№ сказа(аў)
Прыметнік у форме вышэйшай ступені параўнання	*3, 7*
Прыметнік у кароткай форме	*1, 6*
Адносны прыметнік	*3, 5*
Прыметнік у пачатковай форме	*2*
Прыметнік у ролі выказніка	*1, 2, 3, 6, 7*

Заданне 6. Запішыце прапушчанае слова ў словаўтваральным ланцужку. Устанавіце спосаб утварэння.

Максімальная колькасць балаў – 4 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

Адказ: *1) Дрым-от-а (суфіксальны); 2) дрыгв-ян-ы (суфіксальны); 3) драў-нін-а (суфіксальны); 4) вастр-а-слов-і-ць (асноваскладанне+суфіксацыя); 5) малаўжывальны (словаскладанне); 6) за-лішні (прыставачны); 7) запруд-Ø-а (нулявая суфіксацыя); 8) велік-а-душ-н-ы (асноваскладанне+суфіксацыя).*

Заданне 7. Прачытайце сказы. Дайце характарыстыку сказам паводле колькасці граматычных асноў (просты ці складаны). Вызначце сінтаксічную ролю выдзеленага слова. Увага! Знакі прыпынку не пастаўлены.

Максімальная колькасць балаў – 5
(0,5 бала – за правільную характарыстыку, 0,5 – за правільна вызначаны член сказа).

Сказ	Характарыстыка	Сінтаксічная роля
*Імгла заслала сіні **далягляд** і журавы ляцяць вяслуюць к Нілу.*	*складаны*	*дапаўненне*
*Адзін Сымон **хадзіў** па пакоях ды толькі пасвістваў на ўсе лады.*	*просты*	*выказнік*
*Ёлкі цёмныя намоклі сушаць вербы пасмы **жоўтых** кос.*	*складаны*	*азначэнне*
*Светлая хмарка **ціха і спакойна** плыла ў небе.*	просты	*акалічнасць*
*Дзеці рассыпаліся **па лесе** і агаласілі яго сваім крыкам.*	просты	*акалічнасць*

Заданне 8. Пастаўце адпаведныя знакі ў пустыя клеткі табліцы. Пры адказе "так" пастаўце знак "+", пры адказе "не" – пастаўце "–".

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).

№ п/п	Пытанне	Адказ
1.	Ад зваротка можна паставіць пытанне да выказніка. А гэта значыць, што зваротак з'яўляецца членам сказа	–
2.	У сказе аднародныя члены сказа заўсёды раздзяляюцца коскай	–
3.	Мнагазначныя словы – словы, якія маюць некалькі лексічных значэнняў	+
4.	Перанясенне ўласцівасцей з аднаго прадмета на другі на аснове іх падабенства называецца эпітэтам	–
5.	Віды казак: 1) пра людзей, 2) бытавыя, 3) пра жывёл, 4) чарадзейныя	–

Заданне 9. Устанавіце адпаведнасць паміж назвай твора і персанажам. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад, А3, Б2, В1, Г5, Д4).

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).

Адказ: А4; Б3; В2; Г5; Д1.

Заданне 10. Запоўніце табліцу, карыстаючыся падказкамі.

Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).

Падказка	Аўтар	Назва	Жанр
	Народ	*"Дамавікова ўдзячнасць"*	*Легенда*
	Уладзімір Караткевіч	*"Лебядзіны скіт"*	Літаратурная казка-легенда
	Ян Баршчэўскі	"Вужыная карона"	*Апавяданне*
	Міхась Лынькоў	*"Васількі"*	Апавяданне
	Народ	*"Лёгкі хлеб"*	*Казка*